**Вернісаж.** Фотавыстаўку Марыны Бацюковай «Мары Марыны. Мінск», прымеркаваную да 955-годдзя горада, прадставілі ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі, паведамляецца на афіцыйным сайце НББ. Рознафарматная экспазіцыя паказвае беларускую сталіцу ў дэталях і панарамным выглядзе. Марына Бацюкова — удзельніца і куратар шматлікіх выставак і праектаў у Беларусі і за мяжой, член Беларускага саюза мастакоў і Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў. Экспазіцыя арганізавана Нацыянальнай бібліятэкай сумесна з Беларускім саюзам мастакоў. Работа выстаўкі «Мары Марыны. Мінск» прадоўжыцца да 23 студзеня 2023 года.